# Мінсувязі, Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі і асацыяцыя «Інфапарк» падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве

11 красавіка 2018 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі» і Навукова-тэхналагічная асацыяцыя «Інфапарк» падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне падрыхтоўкі кадраў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Подпісы пад дакументам паставілі Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Папкоў, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі Андрэй Зяневіч і Генеральны дырэктар Асацыяцыі «Інфапарк» Уладзімір Басько.

Паводле Дагавора бакі маюць намер ажыццяўляць супрацоўніцтва ў пытаннях забеспячэння эканомікі і сацыяльнай сферы высокакваліфікаванымі IT-спецыялістамі з неабходнымі прафесійнымі кампетэнцыямі.

У гэтых мэтах дакументам прадугледжана стварэнне і забеспячэнне функцыянавання Рэсурснага адукацыйнага цэнтра па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях у Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі, а таксама Цэнтра кампетэнцыі па інфармацыйных тэхналогіях, роля якога будзе заключацца ў:

- інтэграцыі сучасных ведаў, перадавога вопыту і кваліфікацый спецыялістаў пры ажыццяўленні інавацыйных праектаў і іншых мерапрыемстваў у сферы інфарматызацыі, высокапрафесійных кансультацыйных паслуг у IT-сферы;
- падборы і аналізе запытаў арганізацый заказчыкаў па колькасці і ўзроўню кампетэнцый патрабуемых IT-спецыялістаў;
- выпрацоўцы і прадастаўленні ў Рэсурсны цэнтр абагульненых патрабаванняў да неабходных кампетэнцый IT-спецыялістаў.

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/11-04-2018-2932*